*Ігар Марзалюк, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*загадчык секцыі археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін*
*Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова*

# ДА ПЫТАННЯ ПЕРЫЯДЫЗАЦЫІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў IX — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVII СТАГОДДЗЯ

Праблема перыядызацыі гісторыі Беларусі дадзенага перыяду да сённяшняга дня з'яўляецца прадметам даволі вострай навуковай дыскусіі, якая мае надзвычай важнае практычнае, прыкладное значэнне. Як трактаваць цывілізацыйную спецыфіку Беларусі на ўроках гісторыі ў школе, на лекцыях у ВНУ? На сённяшні дзень існуе як імкненне да поўнага «накладання» заходнееўрапейскай перыядызацыі на беларускую гісторыю [11, с. 5–8], так і рашучае адмаўленне падобных спроб. Надзвычай выразна другая пазіцыя была сфармулявана Г. Сагановічам [13].

Аўтар паспрабуе выкласці сваё бачанне гэтай праблемы, абапіраючыся на вывучэнне трансфармацый у сацыякультурных працэсах, якія адбываліся ў акрэслены храналагічны перыяд на беларускіх землях. Толькі на падставе вывучэння сацыякультурных стэрэатыпаў, што панавалі ў грамадстве ў той ці іншы час, можна атрымаць і больш набліжаны да рэалій адказ на пытанне аб цывілізацыйнай спецыфіцы беларускай гісторыі. Гэта, у сваю чаргу, дазваляе стварыць яе больш адэкватную перыядызацыю. Спадзяюся, матэрыял будзе карысны і настаўнікам, якія выкладаюць гісторыю Беларусі дадзенага храналагічнага перыяду.

**Перыяд славяна-скандынаўскага сінтэзу** на абшарах Усходняй Еўропы, землях будучай Беларусі, Украіны і Расіі. Яго можна датаваць IX–X стст. Важнейшыя прыкметы гэтага перыяду: узнікненне дзяржаўнай арганізацыі на землях усходніх славян, фарміраванне новых сацыякультурных узораў, якія знайшлі адлюстраванне ў «дружыннай культуры», што выразна кантраставала з этнічнай, «вясковай» культурай крывічоў, радзімічаў і дрыгавічоў; змены ў пахавальнай абраднасці — пад уплывам новых элітарных узораў адбыўся масавы пераход да пахавання ў курганах, спробы уніфікацыі лакальных племянных язычніцкіх культаў і стварэнне агульнаславянскага язычніцкага пантэона (рэформа вялікага князя кіеўскага Уладзіміра) [6; 7; 14; 20, с. 45–55].

**Перыяд візантыйска-ўсходнеславянскага сінтэзу.** За пункт адліку пры вылучэнні данага перыяду бярэцца пачатак хрысціянізацыі нашых земляў па «грэцкім», праваслаўным узоры. Канец яго і рэзкая змена сацыякультурных рэалій адбываецца толькі пасля Крэўскай уніі. Менавіта апошняя падзея мусіць быць важнейшай храналагічнай цэзурай, якая завяршае гэты этап беларускай гісторыі. Для яго характэрны наступныя прыкметы: хрысціянізацыя беларускіх земляў і распаўсюджванне ў сувязі з гэтым кніжнасці і пісьменнасці, узнікненне «высокай» гарадской культуры і мастацтва, зыходнымі архетыпамі для якіх у той час былі візантыйскія ўзоры, знаёмства з візантыйскай канцэпцыяй дзяржаўнай улады [1, с. 468–482; 12; 16, с. 112–113]. Праўда, аднаасобная, самадзяржаўная ўлада на ўсходнеславянскіх землях у той час не стала рэальнасцю. Улада князя была абмежавана вечам і дружынаю, якія істотна ўплывалі на важнейшыя рашэнні ў галіне ўнутранай і знешняй палітыкі. Тады ж на нашых землях афармляецца "дзяржаўны феадалізм", пабудаваны на ўяўленнях аб вярхоўнай уласнасці князя на дзяржаўную зямлю. Як Бог з'яўляецца вярхоўным гаспадаром створанага Сусвету, так і князь па праву нараджэння з'яўляецца адзіным легітымным вярхоўным уласнікам аддадзенай пад яго апеку зямлі. Галоўным элементам княскага права і ў эпоху Кіеўскай Русі, і ў ВКЛ заставалася суверэннасць землеўладання ўдзельнага князя-дынаста. У сваім удзеле ён карыстаўся правам статутаводства, абвяшчэння сваіх распараджэнняў, жалаваных грамат сваім падданым, надання ім земляў пад акрэсленымі ўмовамі службы,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

устанаўлення незалежна ад дзяржавы падаткаў, павіннасцяў і г. д. Князь меў права суда над сваімі падданымі да смяротнай кары ўключна. Удзельны князь-дынаст выступаў як поўны суверэн свайго валодання, з якім ён мог выйсці са складу дзяржавы. У адрозненне ад яго, службовы ўдзел, як і вотчына, знаходзіўся ў сферы вярхоўнага права вялікага князя літоўскага і адчужэнню са складу дзяржавы не падлягаў [18, с. 101]. У гэты час няма падстаў казаць аб афармленні баярскіх імунітэтаў і пра наданне ім права безумоўнага распараджэння зямельнай уласнасцю, атрыманай за службу. Як вядома, падобныя ўзоры дзяржаўнай і сацыяльнай арганізацыі грамадства пасля стварэння ВКЛ на яе першым, «дакрэўскім», этапе існавання распаўсюдзіліся і на ўласна балцкія землі дзяржавы [21].

Неабходна падкрэсліць, што ўжо ў той час нашы землі былі адкрытыя і да рэцэпцыі элементаў заходнееўрапейскай, «лацінскай» культуры. Тое ж самае можна казаць і аб астатніх тэрыторыях дамангольскай Кіеўскай Русі. «Лацінян»-каталікоў (прынамсі да XIII ст.) на масавым узроўні не трактавалі за іншаверцаў [10; 17, с. 256].

Аднак зыходныя, фармаўтвараючыя ўзоры сацыякультурнай традыцыі былі безумоўна звязаныя з візантыйскім культурным колам.

**Вестэрнізацыя беларускай сацыякультурнай традыцыі.** Новы перыяд беларускай гісторыі бярэ свой адлік ад лёсаноснай для беларускіх і літоўскіх земляў падзеі — Крэўскай уніі. Менавіта гэты факт самым істотным чынам спрычыніўся да вестэрнізацыі ВКЛ. Праз наданне прывілеяў спачатку каталіцкай, а потым і праваслаўнай знаці аформіліся феадальныя імунітэты ў класічным, еўрапейскім сэнсе гэтага слова, сфарміраваўся шляхецкі стан. У сярэдзіне — другой палове XV ст. афармляецца адзіны «палітычны народ» ВКЛ [4; 19, с. 452]. У гэты ж час адбываецца фарміраванне мяшчанскага саслоўя праз наданне гарадскім абшчынам Магдэбургскага права. Матэрыяльная культура беларускіх гарадоў таксама набывае выразна вестэрнізаваны характар. Пад уплывам вышэйазначаных працэсаў атрымлівае распаўсюджванне канцэпцыя саслоўна-станавай манархіі, якая змяняе ўяўленні аб дзяржаве як патрыманіяльнай уласнасці вялікага князя. Ідэал «хрысціянскага ўладара» непарыўна звязваецца з гарантаваным захаваннем апошнім правоў і вольнасцяў магнатам, шляхце і гарадам.

**Ранні Новы час.** У XVI — першай палове XVII стст. беларускае грамадства максімальна наблізілася да каштоўнасцяў Новага Часу: у гарадах фарміруецца новая працоўная этыка, грашам надаецца статус самадастатковай вартасці. Ліхвярства ў XVI ст. пачынаюць практыкаваць не толькі гараджане, але і духоўныя асобы і шляхта. Занятак ім шляхціца, згодна з 3-м Статутам, не пазбаўляў апошняга шляхецтва пры ўмове адпраўлення ім земскай службы. Жабрацтва пачынае трактавацца як справа, дапушчальная толькі пры страце чалавекам працаздольнасці [2, с. 290; 5, с. 71–72; 8; 15, с. 123].

Гэты перыяд стаў часам як канчатковага афармлення інстытута шляхецкіх «залатых вольнасцяў», так і поўнага засваення беларускім мяшчанствам прававой канцэпцыі «bohum commune». Важнейшай адзнакай XVI ст. з'яўляецца рэлігійная талеранцыя і мірнае суіснаванне праваслаўных, пратэстантаў і каталікоў. Аднак нарастаўшыя працэсы канфесіяналізацыі і контррэфармацыі спрычыніліся да парушэння канфесійнай раўнавагі і ў выніку рэалізацыі Берасцейскай царкоўнай уніі прывялі да вострага рэлігійнага канфлікту ў беларускім грамадстве. Але не Берасцейская царкоўная унія, па нашым перакананні, мусіць быць ха占налагічнай цэзурай для вызначэння канца гэтага перыяду. Праваслаўная эліта, як, дарэчы, і пратэстанцкая, у першай палове XVII ст. мела магчымасць адстойваць свае інтарэсы на дзяржаўным узроўні і дамагацца адчувальных перамог. У другой палове XVII ст. была замацавана поўная перамога Контррэфармацыі. Рэч Паспалітая пераўтварылася ў каталіцкую дзяржаву праз татальную прававу дыскрымінацыю некаталіцкага насельніцтва.

Кардынальныя змены адбываліся і ў этнічнай самаідэнтыфікацыі беларускай эліты. Менавіта ў XVI — першай палове XVII стст. адбываецца насычэнне тэрміна «русін» этнічным зместам, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі самаідэнтычнасці, сярод якіх важнейшымі становяцца мова і этнічнае паходжанне — «парода», «кроў», а не рэлігійная прыналежнасць [4, с. 158; 9, с. 13]. У гэты час у асяроддзі русінскай інтэлектуальнай эліты пачынае афармляцца канцэпцыя аб'яднанай «кроўю і глебай», супольнай мовай і культурай нацыі, якая мае гіста-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рычныя традыцыі ўласна «рускай» дзяржаўнасці. Упершыню ў айчыннай традыцыі быў агучаны тэзіс аб поліканфесійнасці старабеларускага этнасу, а старабеларуская мова ў творах Францыска Скарыны і Васіля Цяпінскага набыла выразныя ідэалагічныя канатацыі, трактавалася як важнейшы параметр этнакультурнай тоеснасці. Менавіта Васіль Цяпінскі ўпершыню ў айчыннай традыцыі атаясамляў адрачэнне ад уласнай мовы на карысць іншай як форму нацыянальнай здрады, нацыянальную смерць народа. Аднак гэтыя ўяўленні так і не паспелі стаць фактам масавай свядомасці. Этнасацыяльная катастрофа 1654–1667 гг., татальная паланізацыя шляхты і знікненне беларускага урбаністычнага асяроддзя, а разам з ім нацыянальнага трэцяга саслоўя, спынілі гэты працэс і ператварылі старабеларускі этнас у этнас з непаўнавартаснай сацыяльнай структурай.

Такім чынам, можна лічыць цалкам апраўданым скарыстанне ў працэсе навучання гісторыі Беларусі тэрміна «ранні Новы час» у дачыненні да беларускіх рэалій XVI–XVII стст. Перыяд ранняга сярэднявечча больш карэктна адлічваць не з VI, а з IX ст., бо менавіта тады пачаліся працэсы дзяржаваўтварэння на сучасных беларускіх землях, а ў канцы X ст. — далучэнне да хрысціянства.


1. Археалогія Беларусі. — Т. 3. — Мн., 2000.
2. *Бершадский С.А.* Литовские евреи. История их юридического и общественного положения в Литве от Витовта до Люблинской унии. — СПб., 1883.
3. *Галенчанка Г.Я.* Францыск Скарына — беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. — Мн., 1993.
4. *Голенченко Г.* «Шляхетская демократия» в Великом Княжестве Литовском XVI—XVIII вв. // Белоруссия и Россия: Общество и государства. — Вып. 2. — М., 1998. — С. 31–33.
5. *Дмитриев М.В.* Православие и реформация. — М., 1990.
6. *Лебедев Г.С.* Русь и чудь, варяги и готы (итоги и перспективы историко-археологического изучения славяно-скандинавских отношений в I тыс. н. э.) // Славяно-русские древности. Историко-археологическое изучение Древней Руси. Итоги и основные проблемы. — Вып. I. — Л., 1988. — С. 79–99.
7. *Лебедев Г.С.* Varangika в контексте отечественной культуры последних десятилетий // Скандинавские чтения 1998 г. — СПб., 1999. — С. 5–17.
8. *Марзалюк І.* Ментальнасць гарадскога насельніцтва Беларусі ў XVI–XVIII ст. (па матэрыялах Магілёва) // Наш радавод. Матэрыялы міжнар. навук. канф. «Гістарычная памяць народаў Вялікага Княства Літоўскага і Беларусі. XIII–XX ст.» (Гродна, 3–5 ліпеня 1996 г.). — Кн. 7. — Гродна, 1996. — С. 239–241.
9. *Марзалюк І.* Этнічная і канфесійная самаідэнтычнасць насельніцтва Усходняй Беларусі ў XI—XVIII ст. // Мінулая і сучасная гісторыі Магілёва. — Магілёў, 2001. — С. 13–23.
10. *Перхавко В.Б.* Культурные контакты Древней Руси с соседними католическими странами Европы в XI—XIII вв. // Славяне и их соседи. Католицизм и православие в средние века. — М., 1991. — С. 11–15.
11. Праграма па гісторыі для базавых агульнаадукацыйных школ. — Мн., 1995.
12. *Пуцко В.* Аб еўрапейскім кантэксце сярэдневяковага мастацтва Беларусі. // Беларусіка. — Кн. I. — С. 303–306.
13. *Сагановіч Г.* У пошуках сярэднявечча // БГА. — 1997. — Т. 4. — Сш. 1–2. — С. 3–17.
14. *Седых В.А.* Большие курганы Древней Руси // ГАЗ. — 1997. — № 11. — С. 28–31.
15. Статут Вялікага княства Літоўскага. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. — Мн., 1989.
16. *Успенский Б.А.* Избранные труды. Семиотика истории и культуры. — Т. 1. — М., 1994.
17. *Щапов Я.Н.* Княжеские уставы и церковь в Древней Руси. XI–XV вв. — М., 1972.
18. *Яковенко Н.М.* Українська шляхта з кінця XIV до середини XVII ст. (Волинь і Центральна Україна). — Київ, 1993.
19. *Kloczowski J.* Mlodsza Europa. — Warszawa, 1998.
20. *Leciejewicz L.* Wyznacznik pozycji spolecznej w rytuale pogrzcbowym wczesniejszego sredniowiecza // Czlowiek w spoleczenstwie sredniowiecznym. — Warszawa, 1997. — S. 45–55.
21. *Ochmański J.* Ruskie wzory organizacyjne w państwe litewskim 14–15 wieku // Ochmański J. Dawna Litwa. Studia historyczne. — Olsztyn, 1986. — S. 75–82.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова